19. Жданова, А. В. К истории возникновения литературного феномена ненадежной наррации. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/k-istorii-vozniknoveniya-literaturnogo-fenomena-nenadezhnoy-narratsii/viewer. – Дата доступа : 21.10.22.

20. Уэллек, Р. Теория литературы / Р. Уэллек, О. Уоррен / Предисл. А. Аникста. – М.: Прогресс, 1978. – 328 с.

21. Morris, D. B. Gothic Sublimity / *New Literary History*. – Vol. 16, No. 2 / The Sublime and the Beautiful: Reconsiderations // The Johns Hopkins University Press. – 1985. – P. 299 – 319.

22. Mansfield, K. Sensationalising the New Woman: Crossing the Boundaries between Sensation and New Woman Literature // Dissertation for the degree of PhD in English Literature at Cardiff University. – December, 2018. – 402 p.

23. Gilbert, S. M., Gubar, S. The Madwoman in the Attic. The Woman Writer and the Nineteenth Century Literary Imagination. Second Edition. Yale University Press: New Haven and London, 2000. – 719 p.

**М. А. Курыпка,**

*ст. выкладчык (Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт, Мінск, Беларусь)*

## МАСТАЦКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫ НАРАТЫЎ Ў РАМАНЕ М. ЭМІСА «ЗОНА ІНТАРЭСАЎ»

***Анатацыя.*** *У артыкуле раглядаецца асэнсаванне М. Эмісам тэмы Другой сусветнай вайны праз мастацкую апрацоўку дакументальных фактаў. Вывучэнне дакументальнай і крытычнай літаратуры дазваляе аўтару арганічна спалучыць дакументальнасць і мастацкасць жыцця асобы ў экстрэмальных умовах вайны, раскрыць складаны комплекс адзінства рацыянальнага і інтуітыўнага, свядомага і падсвядомага ў душы чалавека.*

***Ключавыя словы:*** *дакументальнае; Другая сусветная вайна; мастацкае; сучасная ваенная проза; Халакост.*

**M. A. Kouripka,**

*Ass. Lecturer* (*Minsk State Linguistic University, Minsk, Belarus)*

## FICTIONAL AND DOCUMENTARY NARRATIVE IN M. AMIS'S «THE ZONE OF INTEREST»

***Abstract.*** *The article examines M. Emis's interpretation of the theme of the Second World War through the artistic understanding of documentary facts. The study of documentary and critical literature allows the author to combine documentary and artistic vision of a person's life in the extreme conditions of war and to reveal a complex of the unity of the rational and intuitive, the conscious and subconscious in the human soul.*

***Key words:*** *contemporary war novel; documentary narration; fiction; the Holocaust; World War II.*

Адной з вызначальных рыс сучаснай ваеннай прозы канца XX – пачатку XXI ст. з'яўляецца цеснае суіснаванне жанру рамана на скрыжаванні навукі, публіцыстыкі і літаратуры. Падобны сінтэз сведчыць аб тым, што ваенная проза не толькі фарміруе пэўны пласт літаратуры, але і аб'ядноўвае разнастайнасць светапогляд аў і праблематыкі. Даследчыца Т. Камароўская падкрэслівае дакументалізм як характэрную рысу сучаснай мастацкай прозы, дзе адбываецца *«шырокі зварот пісьменнікаў да дакументу не толькі на стадыі збору матэрыялу і фарміраванні мастацкай ідэі, але і пры стварэнні мастацкага твора»* [1, с. 128] (Тут і далей пераклад на беларускую мову наш – М. К.). У гэтым выпадку ўздзеянне дакументальнай літаратуры і дакументалізма як літаратурнага метада дазваляюць ваеннай прозе ўзбагаціць мастацкую і гістарычную праўдзівасць твораў,

пашырацца ідэйна і змястоўна, аказваць моцнае ўздзеянне на чытача.

Сучаснай ваеннай прозе таксама ўласцівы аналіз дакументальных матэрыялаў і іх дакладнае ці частковае мастацкае ўвасабленне, што дазваляе пісьменнікам выйсці за рамкі выкарыстання мастацкага вымыслу. Свядомай устаноўцы на дакументальна-мастацкую дакладнасць падзей спрыяе той факт, што пэўная колькасць архіваў і дакументацыі часоў вайны ці пасляваенных гадоў застаецца невядомай чытачу, а некаторыя матэрыялы ўвогуле застаюцца засакрэчанымі. Акрамя гэтага інтарэсам да мінулага, тым больш, што паступова адыходзіла ад творчасці ці з жыцця вялікае кола пісьменнікаў, якія з'яўляліся непасрэднымі ўдзельнікамі ці дарослымі сведкамі вайны.

Разам з тым, ваенная проза нават на дакументальнай аснове – гэта перш за ўсё персанальны погляд пісьменніка на падзеі, і калі дакументальны матэрыял дае адказ на пытанне «што дакладна адбылося», то дакументальна-мастацкая літаратура ўсё ж звяртаецца да аповеду «як усё адбывалася» як знешне, так і ўнутры чалавека. Таму зразумела, што ваенная проза ў гэтай жанравай галіне можа лічыцца не інфармацыйнай першакрыніцай, а сродкам максімальна блізкага спазнавання рэчаіснасці праз светапогляд і светаадчуванне пісьменніка.

Яскравым прыкладам сінтэзу дакументальнага і мастацкага можа служыць раман М. Эміса (*Martin Louis Amis, 1949– )* «Зона інтарэсаў» *(«The Zone of Interest», 2014)*, які ў жанравых адносінах уяўляе сабою змешаную форму мастацкага даследавання, дакументальнага аналізу, рамана-споведзі ці нават інтэрв'ю. Рэчаіснасць канцлагера Аўшвіц, жыццё нацысцкіх функцыянераў і доказы іх злачынстваў падаюцца ў мастацкай апрацоўцы. Але на працягу ўсяго твора адчуваецца глыбокая інфармаванасць і дасведчаннасць пісьменніка ў дачыненні да гісторыі нацысцкай машыны вынішчэння.

Калі адчуваеш, што паміж фактам і мастацкай задумай няма супярэчлівасці, твор успрымаецца рэалістычна, яму верыш і разумееш, што ўсё, што адбываецца, магло адбывацца на самой справе. Пры гэтым зразумела, што «Зона інтарэсаў» не належыць выключна да дакументальнага жанру, бо перш за ўсё з'яўляецца мастацкай апрацоўкай рэальных фактаў ці вопыту сведкаў падзей.

Раман М. Эміса «Зона інтарэсаў» прыўнёс новае незвычайнае гучанне ў даволі распрацаваную ў англійскай літаратуры тэму Халакосту. Папярэдні раман пісьменніка «Страла часу, ці Прырода злачынства» *(Time's Arrow or the Nature of the Offence, 1991)* вызваў шквал эмоцый і вельмі неадназначную рэакцыю грамадства за *«агрэсіўныя і амаральныя метады Меніпавай сатыры»* [2, с. 142] у адлюстраванні сваёй жорсткай філасофіі скандальнага і эксцэнтрычнага, што не перашкодзіла М. Эмісу атрымаць «Букера» за выдатнае даследаванне глыбінь чалавечай памяці ў пошуках зерня злачынства.

У рамане «Зона інтарэсаў» пісьменнік ідзе далей у сваіх пошуках і паказвае трагедыю Халакосту праз погляд тых, хто ў ім прымаў непасрэдны ўдзел: камандуючага персаналу нямецкага канцэнтрацыйнага лагера Аўшвіц, афіцэраў СС і грамадзянскіх асоб. Абвешчаны некалі «майстрам вытанчанага шоку», у сваім рамане «Зона інтарэсаў» М. Эміс зноў імкнецца пацвердзіць сваё рэнамэ «кепскага хлапчука сучаснай літаратуры», ствараючы *«карнавальны амаральны свет, у якім вакханальны хаос выцясняе дапушчальную рэчаіснасць»* [2, с. 151].

У адказ на крытыку пісьменнік яшчэ ў 2002 годзе вызначыў сваю пазіцыю ў адносінах да падзей вайны ў рамане «Коба Грозны» *(«Koba the Dread: Laughter and the Twenty Million», 2002)*, творы, які з'яўляецца яшчэ адным прыкладам мастацка-дакументальнай працы М. Эміса з вытрымкамі з мемуараў, газет і дакументаў таго часу. Аўтар падкрэслівае: *«Гэта не толькі пытанне знешняга дэкоруму. Што датычыцца Германіі, то ўсялякі смех тут быў абсалютна выключаны. Справа не ў тым, што пасля Аўшвіца стала немагчымай разнастайная паэзія. На самой справе пасля яго немагчымым стаў смех»* [3, с. 19], што характарызуе сарказм і іронію рамана «Зона інтарэсаў» не спробамі пакпіць з табуіраванай тэмы, а жаданнем сучаснымі сродкамі *«апісаць неапісальнае» «прымушаючы кожнага асобнага героя насміхацца з самога сябе»* [4, с. 153].

Калі прыняць да ўвагі, што іронія і ёсць своеасаблівая *«абарона індывідуальнасці ад умяшання грубага*

*абсурднага свету»* [5, с. 63], становіцца зразумелым, чаму іранічны настрой знайшоў сваё адлюстраванне ў літаратурных творах нават на тэму Халакосту. Справядліва заўважае В. Джумайла, калі разважае аб іранічнасці, з якой М. Эміс падышоў да гэтай тэмы, бо горкая іронія *«вымушае зразумець, што вышей гісторыі, сучаснасці і расказу аб іх – непазбыўная памяць аб болю і страх паўтарэння памылак, што становіцца апошняй апорай чалавецтву»* [6, с. 108].

Раман складаецца са шматлікіх сюжэтных ліній, кожная з якіх фарміруе асобныя погляды на выкладанне фактаў. Падзеі твора разгортваюцца з трох пунктаў гледжання: Ангелюса Томсена, пляменніка сакратара Гітлера Марціна Бормана, каменданта канцэнтрацыйнага лагера Аўшвіц ІІІ Паўля Доля і габрэя Шмуля, кіраўніка асобага падраздзялення вязняў лагера, якія займаліся ўтылізацыяй мёртвых цел.

Кожная глава, часам адрозніваючыся сваім хранатопам, адлюстроўвае асобныя жыццёвыя лініі галоўных герояў, іх думкі і інтарэсы, якія, паступова перасякаючыся, зводзяцца да аднаго месца, увасобленага агульнай назвай рамана, − канцлагера Аўшвіц ІІІ, яго жылых памяшканняў, фінансавага цэнтра, крэматорыяў − агульнай «зоны інтарэсаў» усіх удзельнікаў рамана, аповед пра якіх вядзецца ад першай асобы кожнага героя.

Калі раман М. Эміса «Страла часу, ці Прырода злачынства», па словах В. Судлянковай, быў прадыктаваны *«менавіта жаданнем пісьменніка прывесці ў мастацкай форме доказы, зрабіць так, каб узрушыць чытача і тым самым прымусіць яго задумацца аб прыродзе злачынства»* [7, с. 54], то ў «Зоне інтарэсаў» пісьменнік ідзе далей, і зверствы нацыстаў на гэты раз займаюць у творы ключавое месца і падаюцца вачыма тых, хто гэтыя зверствы вяршыў, *«падкрэсліваючы той хвалюючы факт, што такія жахі, як нацызм і лагеры смерці сталі магчымымі толькі ў выніку намаганняў простых, непрыкметных людзей, падобных да кожнага з нас»* [4, с. 61]. Сцвярджэнне М. Эміса, што злодзей пры пэўных умовах можа жыць у кожным чалавеку, дазваляе нанова ўбачыць і дзейнасць супрацоўнікаў нямецкай хімічнай прамысловасці, навуковую працу шматлікіх нямецкіх дактароў навук на карысць Рэйху і нават жаданне вязняў лагераў супрацоўнічаць з уладамі, якія іх жа і забівалі.

Нельга дакладна казаць, што характэрная для творчасці М. Эміса постмадэрнісцкая манера пісьма (*«недасказанасць, падтэкст, унутраны маналог, паліфанічнасць, мноства апавядальнікаў, дваістае бачанне, разнастайныя гульні з чытачом»* [4, с. 54]) у поўнай ступені праявілася ў рамане «Зона інтарэсаў». Наадварот, твор характарызуецца лінейнасцю і паслядоўнасцю падзей з некаторымі адхіленнямі ад цэнтраапавядання, паступова набліжаючыся да фінальнай развязкі. У адной са сваіх рэцэнзій газета «The Guardian» ахарактарызавала раман як зусім не характэрны для творчасці М. Эміса: *«без лінгвістычных фінтоў, постмадэрнісцкай гульні, з істотна стрыманым і тонкім гумарам, каб уявіць немагчымае»* [8].

Раман «Зона інтарэсаў» пазбаўлены панарамнасці, зводзячы ўсе асноўныя падзеі да аднаго месца – лагера смерці Аўшвіц ІІІ, што дазваляе пісьменніку засяродзіць большую ўвагу на непасрэдна саміх дзеючых асобах. Нягледзячы на тое, што тэма Халакосту даволі глыбока распрацавана ў англійскай літаратуры (прыкладам могуць служыць раманы К. Гершан *(Karen Gershon, 1923–1993)* «Хлеб выгнання» *(«The Bread of Exile», 1985)*, Ф. Кера *(Philip Kerr, 1956–2018)*, «Берлінская ноч» *(«Berlin Noir», 1993)*, Б. Элтана *(Ben Elton, 1959–)* «Два браты» *(«Two Brothers», 2012)*, Р. Брука *(Rhidian Brook, 1964–)* «Водгук» *(«The Aftermath», 2013)* і інш.), М. Эміс звяртаецца да гэтай тэмы з уласцівай яму нестандартнай падачай вядомых фактаў і пэўнай доляй іроніі і сарказму.

Пісьменнік падае вынішчэнне людзей не толькі як жудасную з'яву ў гісторыі планеты, але і як сапраўдны бізнес, пастаўлены на паток не толькі ідэолагамі і звар'яцелымі садыстамі, але і навукоўцамі, буйнымі прадпрымальнікамі і проста адукаванымі людзьмі Германіі, што робіць усведамленне тых падзей яшчэ больш агідным і жахлівым.

З вялікім цынізмам гучыць у «Зоне інтарэсаў» пісьмо начальніка аддзела кадраў фармацэўтычнай кампаніі «Bayer», адрасаванае каменданту лагера Паўлю Долю: *«Транспарт са 150 жанчынамі паступіў да нас у добрым стане. Але атрымаць канчатковыя вынікі мы не здолелі, паколькі ў ходзе эксперыменту ўсе жанчыны*

*сканалі. Настойліва просім накіраваць да нас другую групу – той жа колькасці і па той жа цане»* [9, с. 86].

Здзіўленне і сарказм выклікае ў М. Эміса супрацоўніцтва нямецкіх прадпрымальнікаў з нацыстамі: *« − Ну і ну, − сказаў я. – Сусветна вядомы канцэрн мае на ўтрыманні ўласны канцэнтрацыйны лагер. Нечувана! »* [9, с. 30]. Пісьменнік мае на ўвазе тую самую IG Farben – кампанію, якая апынулася на другім месцы па даходах, атрыманых дзякуючы супрацоўніцтву з нацыстамі і выпуску газу «Цыклон Б», які прымяняўся ў газавых камерах нацыстаў. Кампанія таксама дапамагала Йозэфу Менгеле ў ажыццяўленні яго «эксперыментаў» над вязнямі канцэнтрацыйнага лагера, што пісьменнік узгадваў у сваім папярэднім творы «Страла часу, ці Прырода злачынства».

Ужо ў сваім першым рамане-даследаванні Халакосту М. Эміс адзначаў, што не толькі садысты з СС неслі адказнасць за злачынствы супраць чалавецтва, але і тыя, хто імкнуўся нагрэць на вайне свае рукі: *«Валасы для габрэяў ласкава прадаставіла «Фільцфабрык АГ» з Рота, пад Нюрнбергам. Поўныя вагоны валасоў. Вагон за вагонам»* [1010, с. 52].

Па сцвярджэнні самога М. Эміса, раман «Зона інтарэсаў» падаецца чытачуяк з глыбокім дакументальным рэалізмам, так і з *«акцэнтаванай аўтарскай мастацкай мадальнасцю»* [11, с. 74]. Самі дакументы паўстаюць у рамане арганічным сплавам з мастацкім вымыслам і з’яўляюцца неад’емнай часткай сюжэта і структуры твора. Рэальныя гістарычныя факты прысутнічаюць у рамане не толькі як дух часу, але і ў сваім непасрэдным падзейным увасабленні (лагер смерці Аўшвіц, які называецца ў рамане агульнай абрэвіятурай KZ – Konzentrationslager, пацверджанае супрацоўніцтва з ім карпарацый «Фарбэн» і «Буна-вэрке»). На старонках твора з’яўляюцца не толькі мастацкія вобразы сапраўдных гістарычных фігур, напрыклад Ільза Грэзэ (вядомая наглядчыца Ірма Грэзэ) ці Паўль Доль (Рудольф Гес), але і рэальныя людзі з рэальнымі біяграфіямі, з якіх асаблівай увагі пісьменніка ўдастойваецца сакратар Гітлера Марцін Борман.

Адыёзная асоба Рэйхсляйтэра вымушае М. Эміса паставіць неадназначнае пытанне: як так здарылася, што звычайныя, але не апошнія па сваім інтэлекце людзі праявілі сябе ў самым крывавым свеце, а за імі ўслед ішлі яшчэ дзясяткі тысяч «адукаваных Борманаў»?

М. Борман, маючы габрэйскіх продкаў, разважаў аб лёсе венгерскіх габрэяў: *«Першае – канфіскацыя ўсіх матэрыяльных сродкаў... Другое – забарона ўсіх форм эканамічнай і культурнай дзейнасці... І трэцяе – абавязковае нашэнне зоркі... Пасля чаго іх належыць сабраць у спецыяльна адведзеных для гэтага месцах і ізаліраваць. За гэтым у належны час мусіць надысці высылка»* [9, с. 253].

Такім жа ўвасабленнем зла, блізкім па сваім успрыманні рэчаіснасці, жорсткасці і схільнасцю да самаахвяравання ў імя Рэйху («*Вернасць – мой гонар, гонар – мая вернасць. Змагайся. Падпарадкоўвайся. ПРОСТА ПАВЕР!»* [9, с. 222]), з’яўляецца камендант канцлагера Аўшвіц ІІІ Паўль Доль. Па такім жа хісткім мастку ідзе фінансіст і адказны за будаўніцтва гумавыпрацоўчай фабрыкі «Буна-вэрке»: «*сапраўдны арыец (белыя, быццам іней, валасы. Фламанцкі нос, ганарыстая складка рота, адпаведны задзірлівы падбародак.. »* [9, с. 8]) Ангелюс Томсэн.

З першага погляду здаецца, «Гола» не робіць ніякага зла, выключна арганізатарская фігура і бонвіван, асабліва ў параўнанні з адвечна п’яным мяснікам Долем. Герой М. Эміса, тактычны і выхаваны, ўяўляецца тым чалавекам, у якім яшчэ тлее агеньчык чалавечага. Нездарма Ангелюс час ад часу ў сваіх думках знаходзіць у ідэях нацызму фальш, якім яны поўняцца. У канцы вайны ён нават пачынае разумець, што яны, немцы, нарабілі: «*Так, думаў я, як жа магла “дрымотная зямля паэтаў і летуценнікаў”, самая высокаадукаваная нацыя, якую ведаў свет, як магла яна пагадзіцца наклікаць на сябе такую дзікую, такую фантастычную ганьбу ‹...› Адкуль узялася патрэба ў такім метадычным, педантычным і скрупулёзным даследаванні скоцкага пачатку ў чалавеку?»* [9, с. 287]. У думках Томсэн звяртаецца да вядомага пытання, якое ўжо было агучана італьянскім пісьменнікам П. Леві «А ці ж гэта чалавек?».

На працягу ўсяго рамана М. Эміс з песімізмам прасочвае ў характары «нейтральнага» Томсэна выключныя асабістыя намеры, якія зусім не супадаюць з агульначалавечымі прынцыпамі і мараллю. Якая цана

яго пасляваеннага пакаяння (*«усе мы здабылі разуменне, усе мы не здолелі пазбегнуць адкрыцця, якое сказала нам, хто мы такія»* [9, с. 285]), калі напрацягу ўсёй вайны ён займаўся арганізацыяй гумавай фабрыкі «Буна-вэрке», выкарыстоўваючы бясплатную фізічную працу вязняў канцэнтрацыйнага лагера.

Але глыбокае расчараванне ў ідэях Трэцяга рэйху і жаданне зрэшты змяніць становішча рэчаў (Ангелюс паступова прыходзіць да ідэі сабатажу на сваёй жа фабрыцы, уваходзіць у змову з палонным брытанскім афіцэрам, што заканчваецца арыштам самога Ангелюса Томсэна). Падобныя характары дапамагаюць раздзяліць тых, хто яшчэ не зусім страціў чалавечае аблічча, і тых, хто гэтую мяжу перасёк. Такім героям М. Эміс ужо «не дае спуску», даводзячы іх вобразы да найвышэйшай ступені амаральнасці і бесчалавечнасці.

Адсюль эмісаўская сюжэтная схема – не выварочваць традыцыю навыварат, а проста ісці далей таго, дзе яго папярэднікі проста паставілі б кропку. У выніку перад чытачом увесь час паўстаюць пытанні: «а гэта ён зробіць?», «а гэта?», «няўжо яму і на гэта сумлення хопіць?». Адсутнасць сумлення ў чалавека, што стаў на сцяжыну зла, не паддаецца ў Эміса сумненню, іншая справа, што пісьменнік апантаны ідэяй вызначыць межы гэтага зла.

З камендантам Аўшвіца III Паўлем Долем чытач сустракаецца, калі ён фанабэрыста прымае цягнік з новапрыбыўшымі габрэямі з Парыжа: *«ніхто не сказаў бы, што на пероне я не выглядаў імпазантна: грудзіна колам, дужыя кулакі прыціснутыя да абцягнутых галіфэ бёдраў, ногі ў высокіх ботах расстаўленыя не менш чым на метр»* [9, с. 21]. Праз некаторы час Доль цешыцца чарапамі забітых, пасля таго, як толькі што трымаў на каленях сваіх уласных дочак, а ў хуткім часе пісьменнік прапануе нам убачыць, як гэты «звышчалавек» пералічвае косткі ля пахавальнага вогнішча: «*голы па пояс, нацягнуўшы процівагаз, Доль падобны да старой валасатай пакаёвай мухі (мухі, час якой набліжаецца да скanання)»* [9, с. 138].

Падобныя сцэны выклікаюць натуральную агіду, пагарду, здаровую злосць, і становіцца відавочным, што тыя з чытачоў, хто здолее вытрымаць падобную канцэнтрацыю жахаў, атрымаюць моцную «ін’екцыю» супраць тых самых спроб гераізацыі ці прымірэння з фактамі ваенных і проста чалавечых злачынстваў.

З прычыны свайго ўзросту М. Эміс не мог мець уласнага вопыту Другой сусветнай вайны, аднак яго ацэнкі і назіранні за чалавечымі паводзінамі і думкамі, што такое вайна, якой яна апынулася на самой справе і якой мусіць быць памяць аб ёй, сведчаць аб вельмі глыбокім валоданні пісьменнікам матэрыялам, аб’ём якога М. Эміс падае ў пасляслоў і рамана «Зона інтарэсаў». Пісьменнік працаваў, вывучаючы гістарычныя матэрыялы: у рамане прасочваюцца спасылкі на рэальныя факты і падзеі (капітуляцыя 6-й арміі, Ванзейская канферэнцыя) і падаецца вялікі спіс рэальных людзей, якія мелі дачыненне да тых дзён, мастацка-дакументальных украпінаў: думкі, замалёўкі і сцэны з жыцця самога Бормана і нямецкіх партыйных дзеячаў, вытрымкі з гістарычных дакументаў і г.д.

Раман «Зона інтарэсаў» атрымаўся больш мастацкім, чым дакументальным раманам-хронікай, але гэта яркая і вобразная гісторыя пра трагедыю асобных людзей і цэлых народаў. М. Эміс глыбока пранікае ў душу сваіх герояў, выкрываючы таямніцы самых патаемных куткоў душы людзей, якія свядома прымаюць удзел у вынішчэнні сабе падобных. Пісьменнік актыўна ўмешваецца ў спрэчку аб з’яўленні зла, аб чым ён ужо пісаў у сваім рамане «Страла часу, ці Прырода злачынства»: адкуль у звычайным чалавеку з’яўляецца жаданне забіваць сабе падобных?

Пісьменнік прыходзіць да думкі, што пошукі адказу на пытанне, чаму гэта ўсё адбылося, дарэмнае, бо, звяртаючыся да слоў вядомага даследчыка Халакосту П. Леві, *«“разуменне” нейкай прапановы або паводзін чалавека азначае яго “прыманне” ў сябе, прыманне аўтара прапановы, спробу паставіць сябе на месца гэтага чалавека, атаясаміцца з ім. Але ж ніводная нармальная чалавечая істота ніколі не зможа атаясаміць сябе з Гітлерам, Гімлерам, Гебельсам, Эйхманам і незлічонымі іншымі. Гэта палохае нас, але і прыносіць нам палёгку, пакольку пажадана, быць можа, каб іх словы (і, на жаль, справы) заставаліся для нас неспасціжнымі»* [9, с. 310].

Такім чынам, М. Эміс адкрывае свой шлях памяці. Сакрэт нацысцкага вар’яцтва заключаецца не толькі ў

масавай прафесійнай прамыўцы мазгоў, ахвярай якой пала Германія  30–40-х гадоў, але і гульні на самых ганебных і подлых чалавечых жаданнях людзей незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці. А значыцца, забыцца аб гэтых злачынствах ці даравaць тым, хто гэта здзейсніў, з’яўляецца для М. Эміса таксама злачынным. М. Эміс бязлітасны ў дэтальным адлюстраванні жахаў ваеннай рэальнасці. Агідныя праявы распаду і дэградацыі чалавека прымушаюць чытача задумацца, будзяць сумленне і маральнасць, а дакументальна-аб’ектыўнае ўсведамленне трагічных падзей мінулага дазваляе пазбегнуць недаацэнкі, перагляду ці прымірэння з многімі катэгорыямі, якія маюць дачыненне да гісторыі Другой сусветнай вайны.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Комаровская, Т. Е. Исторический роман США XX века : монография / Т. Е. Комаровская. – Минск : БГПУ, 2019. – 238 с.
2. Keulks, G. Father and son: Kingsley Amis, Martin Amis, and the British novel since 1950 / G. Keulks. – Madison: Univ. of Wisconsin Press, 2003. – 328 p.
3. Эмис, М. Сталин: Иосиф Грозный : пер. с англ. / М. Эмис. – М. : Эксмо, 2003. – 416 с.
4. Tredell, N. The fiction of Martin Amis / N. Tredell. – Houndmills : Palgrave Macmillan, 2000. – 208 p.
5. Гребенникова, Н. С. Традиция пародийно-иронического воспроизведения действительности в современной английской литературе / Н. С. Гребенникова// Пути освоения художественного опыта в зарубежной литературе : сб. ст. / Иркут. гос. пед. ин-т ; отв. ред. Э. П. Зиннер. – Иркутск, 1987.  С. 63–76.
6. Джумайло, О. А.  Английский исповедально-философский роман 1980–2000 / О. А. Джумайло. − Ростов-на-Дону : Изд-во Южного федерального университета, 2011. – 320 с.
7. Судленкова, О. А. Современное осмысление второй мировой войны в английской литературе / О. А. Судленкова // Материалы ежегодной научной конференции студентов и магистрантов университета, 18–19 апреля 2006 г. : в 5 ч. / Мин. гос. лингвист. ун-т ; редкол.: Н. П. Баранова (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2006. – Ч. 4. – С. 227–231.
8. Preston, A. The Zone of Interest review – Martin Amis's impressive holocaust novel [Electronic resource]/ H. A. Preston // The Guardian. –Mode of access: https://www.theguardian.com/books/2014/sep/07/the–zone–of–interest–review–martin–amis–impressive–holocaust. – Date of access: 04.09.2018.
9. Amis, M. The Zone of Interest / M. Amis. – London : Vintage, 2015. – 310 p.
10. Эмис, М. Стрела времени, или Природа преступления : роман / М. Эмис ; пер. с англ. А. Яковлева. – М. : Эксмо ; СПб. : Домино, 2004. – 184 с.
11. Сінькова, Л. Д. Беларуская “звышлітаратура”: літаратуразнаўчыя і літ. – крыт. артыкулы / Л. Д. Сінькова. – Мінск : Кнігазбор, 1996. – 224 л.



**Е. Д. Можейко,**

магистрант (*Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова, Могилев, Беларусь*)


## ИНТЕРТЕКСТУАЛЬНОСТЬ КАК ОДНА ИЗ ОСНОВНЫХ КАТЕГОРИЙ ЛИТЕРАТУРЫ ПОСТМОДЕРНИЗМА


***Аннотация.*** *Интертекстуальность является одной из основных черт современной литературы постмодернизма. В статье рассматривается теоретический аспект понятия интертекстуальность на основе работ Ю. Кристевой и Р. Барта. На примере романа П. Акройда «Процесс Элизабет Кри» выделены случаи проявления интертекстуальности в литературе постмодернизма.*